# ИННОВАЦИИ В ОБУЧЕНИИ ИНОСТРАННЫМ ЯЗЫКАМ

**Ю. В. БЕЗНІС, А. А. ЛАПКО**
Беларусь, Мінск, БНТУ

## ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ ПРЫМЯНЕННЯ МЕТАДУ НАВУЧАННЯ Ў ПАДГРУПАХ ПРЫ АРГАНІЗАЦЫІ ПРАЦЫ Ў ВЯЛІКІХ СТУДЭНЦКІХ ГРУПАХ

У апошнія часы выкладчыкі замежнай мовы, якія працуюць у няпрофільных установах адукацыі сутыкаюцца з неабходнасцю арганізоўваць навучальны працэс у групах, якія складаюцца з вялікай колькасці студэнтаў, якія адначасова маюць розны ўзровень сфарміраванасці моўных навыкаў. Аднак спецыфіка вывучэння замежнай мовы мае на ўвазе, што аптымальная колькасць навучэнцаў у вучэбнай групе павінна складаць 10–12 чалавек. Менавіта такі колькасны склад удзельнікаў адукацыйнага працэсу гарантуе максімальна эфектыўнае і прадуктыўнае фарміраванне, удасканаленне і развіццё як моўных, так і маўленчых навыкаў і ўменняў студэнтаў. Але рэчаіснасць такая, што рэальны колькасны склад студэнцкіх навучальных груп складае 20–25 чалавек, што ставіць перад выкладчыкам задачу пошуку такіх формаў арганізацыі навучальнага працэсу, якія дазволяць максімальна эфектыўна рэалізаваць патэнцыял студэнтаў і дасягнуць добрай выніковасці навучання.

Працаваць з вялікай групай, вядома, цяжка, але гэта і пэўны вызаў выкладчыку, які імкнецца зрабіць працэс навучання прывабным і карысным для навучэнцаў. У вялікіх групах у выкладчыка ёсць магчымасць максімальна праявіць свае арганізатарскія, кіраўніцкія, крэатыўныя навыкі, каб зрабіць працэс навучання прадуктыўным і камфортным для ўсіх удзельнікаў. У вялікіх групах сустракаюцца студэнты не толькі з розным узроўнем моўнай падрыхтоўкі, але і з рознымі тыпамі ўспрымання і засвойвання інфармацыі, з розным узроўнем сфарміраванасці навыкаў самастойнай працы, з рознымі пазнавальнымі патрэбамі, што ставіць перад выкладчыкам задачу больш стараннага і прадуманага планавання кожнага навучальнага занятку, пошуку найбольш плённых спосабаў прадстаўлення інфармацыі і ацэньвання выніковасці вучэбнай дзейнасці, вырашэння пытання падтрымання рабочай дысцыпліны падчас заняткаў.

Варта таксама адзначыць, што студэнты атрымліваюць шэраг пераваг, калі вучацца ў вялікай групе: яны маюць магчымасць абменьвацца мноствам ідэй і думак, дзяліцца ўласным жыццёвым вопытам і пераймаць вопыт аднагрупнікаў. Студэнты набываюць навыкі працы ў калектыве, выпрацоўваюць стратэгіі прыняцця сумесных рашэнняў, вучацца несці адказ-

насць за прыняцце рашэнняў, аказваць адзін аднаму дапамогу, набываюць жыццёва неабходныя навыкі памяркоўнасці і стрыманасці ў адносінах да аднагрупнікаў, якія выказваюць іншыя думкі і погляды.

Практычны досвед працы ў вялікіх групах паказаў, што традыцыйныя і такія любімыя выкладчыкамі формы працы, як франтальная і індывідуальная, аказваюцца малаэфектыўнымі і не даюць рэальных вынікаў. Такім чынам, мэтазгодна знайсці формы і метады арганізацыі адукацыйнага працэсу, якія створаць перадумовы для фарміравання камунікатыўных кампетэнцый на замежнай мове і навыкаў працы ў супрацоўніцтве. Базісам такіх тэхналогій з’яўляецца персанальная зацікаўленасць і актыўнасць кожнага асобнага студэнта, жаданне кожнага навучэнца прымаць самастойнае рашэнне ў ходзе сумеснага абмеркавання магчымых варыянтаў. Арганізацыя працы ў падгрупах валодае значным адукацыйным патэнцыялам для дасягнення гэтых мэтаў. У метадычнай літаратуры падгрупа вызначаецца як згуртаванне, якое складаецца з двух або больш індывідаў, якія ўзаемадзейнічаюць і ўплываюць адзін на аднаго [1].

Перад навучэнцамі, якія працуюць у падгрупе, стаіць праблема сумеснага выканання пастаўленай задачы, пры гэтым характар праблемы такі, што яе рашэнне магчыма толькі пры супольным супрацоўніцтве ўсіх членаў падгрупы, а часам і ўсіх падгруп цэлай акадэмічнай групы. Адначасова змяняецца і роля выкладчыка: ён перастае быць першаснай крыніцай інфармацыі і ведаў, якія перадаюцца студэнтам, а таксама адзіным кантралюючым суб’ектам, але становіцца кансультантам і дарадчыкам, які накіроўвае дзейнасць кожнай падгрупы, забяспечвае студэнтаў усім неабходным арсеналам метадаў і прыёмаў для арганізацыі працы ў межах рашэння вучэбных і метадычных задач.

У сваёй працы пры арганізацыі адукацыйнага працэсу ў вялікіх навучальных групах (дваццаць і больш студэнтаў) па дысцыплінах “Замежная мова (англійская)” і “Замежная мова (прафесійная лексіка)” выкладчыкі кафедры “Англійская мова № 1” БНТУ актыўна і эфектыўна рэалізуюць працу навучэнцаў у падгрупах. Зыходзячы з нашага вопыту, рашэнне навучальных і выхаваўчых задач лепш за ўсё ажыццяўляецца ў гетэрагеннай падгрупе, у склад якой выкладчыкам уключаюцца студэнты з розным узроўнем сфарміраванасці моўных і маўленчых навыкаў, што і садзейнічае больш спрыяльнаму ўзаемадзеянню і супрацоўніцтву. Моцны, матываваны студэнт з’яўляецца лідарам і прыкладам для астатніх студэнтаў, аднак нельга дапускаць сітуацый, у якіх лідар перацягне на сябе ўсю ўвагу, зводзячы ўклад астатніх удзельнікаў падгрупы ў калектыўным выкананні задання да мінімуму. Таксама пры фарміраванні падгруп важна ўлічваць характар міжасобасных адносін паміж студэнтамі. Нашы назіранні паказваюць, што адносіны добразычлівасці, узаемнай сімпатыі і цікавасці ствараюць

у падгрупе атмасферу ўзаемаразумення і ўзаемадапамогі, здымаюць пачуццё трывожнасці, боязі здзейсніць моўную або маўленчую памылку. Аднак мы сутыкаліся з сітуацыямі, калі неабходнасць узгадняць дзеянні, несці адказнасць адзін перад адным для дасягнення адзінай мэты адхіляюць антыпатыі паміж студэнтамі на другі план, і паміж удзельнікамі падгрупы ўсталёўваюцца сяброўскія працоўныя адносіны. Такім чынам працу ў падгрупах можна разглядаць таксама як важны механізм вырашэння выхаваўчых задач. Яшчэ адным важным аспектам пры фарміраванні падгруп з'яўляецца іх колькасны склад. Практыка паказвае, што пяць студэнтаў, якія працуюць у адной падгрупе, з'яўляюцца аптымальнай колькасцю для эфектыўнай працы. Падгрупа, якая складаецца з цотнай колькасці навучэнцаў, пры абмеркаванні складанай і спрэчнай праблемы, як правіла, распадаецца на пары і з цяжкасцю прыходзіць да агульнага рашэння [2].

Таксама важна пры арганізацыі працы ў падгрупах выразна і ясна абвясціць заданне для кожнай падгрупы, крытэрыі ацэньвання, час выканання і форму прадстаўлення вынікаў работы падгрупы. Падгрупа здольная быць прадуктыўнай толькі пры аптымальным размеркаванні функцый паміж яе членамі. У сувязі з гэтым намі актыўна выкарыстоўваецца ідэя выбару назіральнікаў-кантролёраў з ліку найбольш моцных студэнтаў, задача якіх уважліва слухаць астатніх членаў падгрупы і рабіць паметкі. Пасля прадстаўлення вынікаў працы кожнай падгрупай яны выступаюць са сваімі дапаўненнямі, заўвагамі і каментарамі, што спрыяе павышэнню матывацыі вывучэння прадмета і самаацэнкі.

Відавочна, што апісаная вышэй арганізацыя супрацоўніцтва выкладчыка і студэнта патрабуе ад першага вялікай папярэдняй працы, больш прадуманай і добра спланаванай арганізацыі навучальнага працэсу ў параўнанні з франтальнай формай. На пачатковых этапах укаранення працы ў падгрупах неабходна навучыць студэнтаў працаваць у малых калектывах, паказаць ім, што кожны навучэнец іграе важную ролю і здольны раскрыць, выкарыстоўваць і развіць свае магчымасці.

СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Кузнецова, М. С. Применение методов группового обучения на уроке английского языка / М. С. Кузнецова // Образовательная социальная сеть. – URL: https://nsportal.ru/shkola/inostrannye-yazyki/library/2013/08/25/primenenie-metodov-gruppovogo-obucheniya-na-uroke (дата обращения: 15.01.2025).

2. Павлов, А. К. Групповая работа как педагогическая технология активного обучения : метод. рекомендации / А. К. Павлов. – URL: https://infourok.ru/pavlov-a-k-gruppovaya-rabota-kak-pedagogicheskaya-tehnologiya-aktivnogo-obucheniya-metodicheskie-rekomendacii-5819805.html (дата обращения: 17.01.2025).